*М.А.Бяспалая*

# ДАБРАЧЫННАСЦЬ ЯК ПРАЯВА ДУХОЎНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА 90-х гг. XIX ст.

Хутчэй за ўсё дабрачыннасць узнікла ў старажытныя часы, бо слабы, нездаляшчы чалавек ці сям'я патрабавалі пэўнага клопату ад абшчыны. Хаця вядомы і супрацьлеглыя маральныя нормы ў адносінах да слабых і хворых, якія існавалі сярод многіх народаў; сюжэты на гэтую тэму нават сталі класікай сусветнага мастацтва. Безумоўна, дабрачыннасць набыла адпаведны змест з узнікненнем рэлігій, у тым ліку і хрысціянства. Можна прызнаць, што ўмацаванне і распаўсюджанне апошняга стала магчымым, дзякуючы самаахвярнай дабрачыннай дзейнасці першых хрысціян.

Хрысціянства пранікнута ідэаламі дабрачыннасці. Усім вядома духоўная трыяда – вера, надзея, любоў. Аднак св. апостал Павел падкрэсліваў, што любоў сярод гэтых духоўных запаведзяў важнейшая, бо любоў да бліжняга свайго прадугледжвае акрамя іншага і шчодрае дзеянне. Хрысціянскія прапаведнікі распрацавалі своеасаблівы "сімвал дабрачыннасці" з двумя складаючымі: духоўная дапамога – парада, падтрымка, навучанне, суцяшэнне, пазбаўленне, прашчэнне і малітва; добрыя справы – апрануць, напаіць, накарміць, выкупіць з няволі, укрыць, дагледзець і пахаваць [1, с. 574]. З гэтых установак бачна, каму патрэбна дапамога – хворым, бедным, малаадукаваным, сіротам і інш. Царква выступіла ініцыятарам і фундатарам сацыяльнай дапамогі не толькі кожнаму, каму яна была патрэбна, але і стварэння сеткі багадзельняў, шпіталяў для хворых, убогіх. Да іх стварэння далучаліся багатыя асобы, гарады, брацтвы і інш. Нагадаем аб існаванні шпіталяў пры праваслаўных брацтвах у XVI – XVIII стст. на тэрыторыі Беларусі.

Уздым прыватнай дабрачыннасці ў XIX ст. звязаны з хуткім ростам гарадскога насельніцтва за кошт сельскага. Безумоўна, апошняе не магло хутка прыстасавацца да гарадскога ўкладу, знайсці сваю эканамічную і сацыяльную нішу, падняцца з гарадскіх нізоў. Калі ў вёсцы найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распаўсюджанай прыметай беднасці было жабрацтва, то ў горадзе пашыраліся злачыннасць, бяздомнасць, прастытуцыя, п’янства і інш. У гэтай сітуацыі царква выступае ініцыятарам дабрачыннай дзейнасці, да якой далучаюцца адукаваныя колы беларускага грамадства, у тым ліку некаторыя землеўласнікі, чыноўнікі, інтэлігенцыя. У мэтах барацьбы з п’янствам пачалі праводзіцца народныя чытанні, а ў канцы 90-х гг. XIX ст. было створана папячыцельства аб народнай цвярозасці. І хаця як за першым, так і за другім стаяла дзяржава, аднак галоўны разлік рабіўся на дабрачынную дзейнасць.

Акрамя названага таварыства і народных чытанняў, у беларускіх губернях і паветах існавала шмат дабрачынных аб’яднанняў. Першае з іх узнікла ў пачатку XIX ст. пад назвай “Мінскае дабрачыннае таварыства”. У канцы XIX ст. яно налічвала 170 правадзейных сяброў, узначальваў яго Г.Э.Чапскі, уладальнік маёнтка Прылукі. У склад таварыства ўваходзіла жонка губернатара, прадстаўнікі такіх вядомых прозвішчаў, як муж і жонка Любанскія, К.Р. Дарэўская-Вярыга і інш. Таварыства мела прыют для сірот і падкідышаў, з 1911 г. існаваў прыют для старых, шпіталь на 245 ложкаў, у год раздавалася бедным больш за 30 тыс. абедаў. Таварыствы з падобнай назвай існавалі і ў гарадах Віцебску, Полацку, Гомелі, Навагрудку, Бабруйску, Барысаве і інш. Іх узначальвалі ўплывовыя асобы, многія таварыствы мелі прыюты, а Віцебскае – нават бібліятэку [2, спр. 6472, л. 25].

Неабходна адзначыць, што дабрачыннасць насіла пэўную ідэалагічную афарбоўку. Мы маем на ўвазе паралельнае існаванне праваслаўных і каталіцкіх дабрачынных таварыстваў у многіх месцах, напрыклад, Полацку, Віцебску, Гомелі і іншых, хаця хрысціянская запаведзь тварыць дабро не прадугледжвае падзел па канфесійнай прымеце.

Найбольш распаўсюджаным відам дабрачынных аб’яднанняў у другой палове XIX ст. можна лічыць таварыствы па аказанні падтрымкі навучэнцам прагімназій, гімназій, вучылішчаў, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, якія мелі абмежаваныя ці зусім не мелі сродкаў для навучання. Таварыствы існавалі ў губернскіх і фактычна амаль ва ўсіх павятовых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнтрах Беларусі. Галоўную задачу сябры таварыства бачылі ў аказанні матэрыяльнай дапамогі бедным студэнтам і навучэнцам і для яе рашэння найбольш прыдатнымі сродкамі лічылі добраахвотныя ўзносы і арганізацыю платных музычна-літаратурных вечароў. У склад таварыстваў уваходзілі мясцовая інтэлігенцыя, чыноўнікі, землеўласнікі. Напрыклад, у Слуцку такое таварыства ўзначальваў дырэктар гімназіі В.М. Іваноўскі, сярод сяброў быў Э.А.Вайніловіч, уласнік маёнтка Савічы, адзін з кіраўнікоў Мінскага таварыства сельскіх гаспадароў, фундатар касцёла свв. Алены і Сымона ў Мінску. У кіраўніцтва Пінскага таварыства ўваходзілі дырэктар і настаўнікі рэальнага вучылішча, а ганаровымі членамі з'яўляліся буйныя мясцовыя землеўласнікі і прадпрымальнікі: князь Э.Г.Друцкі-Любецкі, А.А. Скірмунт, граф К.К. Патоцкі. Мінскае таварыства пэўны час ўзначальваў упраўляючы Лібава-Роменскай чыгункі М.Е.Ададураў, сярод сяброў таварыства можна назваць гарадскога галаву графа К.Э.Чапскага, агранома А.М.Вельямінава, вядомага ўрача Р.К.Яноўскага, землеўласніка і прадпрымальніка А.М.Ельскага і інш. Кожнае з названых таварыстваў было шматлікім, ад 48 сяброў у Пінску, больш за 100 – у Слуцку, да – 320 у Мінску, ад 50 да 200 вагалася колькасць сяброў у таварыствах гэтага кірунку іншых павятовых гарадоў Беларусі [2 спр. 6472, л. 3, 5, 13, 44].

Як ужо ўпаміналася, адной з галоўных формаў работы таварыстваў па аказанні падтрымкі навучэнцам была арганізацыя платных спектакляў, а таксама музычна-літаратурных ці танцавальных вечароў на карысць бедных навучэнцаў. Важнейшым атрыбутам усіх мерапрыемстваў з'яўляўся буфет, выручка ад якога разам з уваходнымі білетамі і складала асноўны артыкул даходаў. Для кіраўніцтва таварыстваў пры наладжванні мерапрыемстваў галоўным было атрымаць дазвол на продаж спіртнога, тады добрая выручка гарантавана, аднак такі дазвол гэтым таварыствам даваўся вельмі рэдка, тым не менш калі-нікалі маглі атрымаць выручку да 400 руб. і нават да 1000. Потым сродкі размяркоўвалі паміж беднымі навучэнцамі, прычым складалася спецыяльная ведамасць у прысутнасці чыноў паліцыі. Гэтыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведамасці даюць уяўленне аб тым, дзе навучаліся выхадцы з Беларусі. Напрыклад, моладзь з Пінска вучыліся ў горным, лясным, будаўнічым, тэхналагічным інстытутах, а таксама інстытуце шляхоў зносін, тым самым рыхтаваліся да працы ў розных галінах гаспадаркі [2, спр. 6491, л. 217 ад).

Існавалі і іншыя дабрачынныя арганізацыі, напрыклад, таварыства "Міласэрнасць", створанае ў Мінску ў 1893 г. Назва таварыства сведчыць сама за сябе, членства ў ім было прадстаўнічым – больш за 250 чалавек, сярод сяброў – вядомыя прадпрымальнікі і землеўласнікі – В.У.Ельскі, Я.А.Наркевіч-Іодка, Л.Л.Ваньковіч, абавязковы член Мінскага прыказа грамадскага прытулку актыўны дзеяч Мінскага таварыства выбітных мастацтваў А.Ф.Хаванскі і інш. [2, спр. 6472, л. 50–51].

Шматлікія дабрачынныя акцыі адбываліся ў падтрымку добраахвотных пажарных дружын. Для гарадоў і вёсак Беларусі вельмі надзённай была барацьба з пажарамі, таму што будынкі, нават большая частка гарадоў мелі драўляную забудову, гарэлі вельмі часта па розных прычынах. Барацьбу з гэтай бядой ажыццяўлялі добраахвотныя пажарныя каманды, якія існавалі ва ўсіх гарадах і мястэчках. Аднак матэрыяльную дапамогу ад дзяржавы яны атрымлівалі мізэрную, таму існаваць маглі за кошт дабрачыннай дапамогі. Методыка яе атрымання была не зусім арыгінальнай, аднак безадказнай. Кожная пажарная каманда ладзіла дабрачынныя мерапрыемствы: літаратурныя і танцавальныя вечары, аматарскія спектаклі, аднак, каб яны былі больш прывабнымі, начальнікі каманд заўсёды прасілі дазвол на арганізацыю буфета з продажам спіртных напояў. І заўсёды губернскія ўлады ішлі насустрач гэтым просьбам, разумеючы, што даход ад такога мерапрыемства будзе прыкметным і пойдзе на вельмі важную справу, на якую ў дзяржавы не хапала сродкаў [2, спр. 6491, 96,102,108].

Дабрачыннасць распаўсюджвалася і на ахвяр стыхійных бедстваў – пажараў, градабіцця, паводку. Сродкі збіраліся падчас платных спектакляў ці літаратурна-музычных вечароў, хаця больш правільна называць іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танцавальнымі. Актыўнасць у гэтым кірунку ў асноўным праяўлялі павятовыя дабрачынныя таварыствы.

Дабрачыннасць не чуралася і палітычных падзей, асабліва выразна грамадская ініцыятыва праявілася пасля так званага "курлаўскага растрэлу" 18 кастрычніка 1905 г. У дадатак да камітэта пры Мінскай гарадской управе быў створаны грамадскі камітэт для аказання дапамогі пацярпеўшым падчас трагедыі. Абодва камітэты аб'ядналі свае дзеянні і займаліся зборам ахвяраванняў для сем'яў забітых і параненых, арганізавалі дадатковае харчаванне параненым, хатнюю медыцынскую дапамогу і інш. У якасці ахвяраванняў было сабрана 7,5 тыс. руб. Сярод актыўных дзеячаў гэтых камітэтаў быў упраўляючы аддзяленнем банка А.В.Ігнатовіч, прысяжны паверааны А.Ф.Хаванскі, дактары В.Л.Лунц, Я.Н.Урсыновіч, чыноўнік казённай палаты Ф.М.Ястрэмскі і інш. [3, с. 3].

Аб хрысціянскім разуменні мэты дабрачыннасці сведчыць з'яўленне таварыства апекі аб сем'ях ссыльных катаржан, апекуном якога з'яўлялася імператрыца Марыя Фёдараўна. У беларускіх губернях рэгулярна арганізоўваліся зборы на яго патрэбы, праўда вынікі былі не надта ўражлівыя [2, спр. 7314, л. 1, 28].

Дабрачынныя акцыі ажыццяўляліся ў гады першай сусветнай вайны і першыя рэвалюцыйныя месяцы 1917 г. Безумоўна, іх аб'ектам сталі сем'і загінуўшых, параненыя, хворыя, бежанцы. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі вельмі шырока практыкаваліся мерапрыемствы на карысць салдацкіх камітэтаў, нацыянальных (латышскіх, украінскіх, польскіх) аб'яднанняў і г.д.

Такім чынам, можна падкрэсліць, што грамадскасць Беларусі не ўхілялася ад выканання хрысціянскіх запаведзяў, у дадзеным выпадку – міласэрнасці. Яна праяўлялася ў розных арганізацыйных формах і відах, аднак мэтай яе з'яўлялася дапамога не толькі канкрэтнай асобе, а аб'яднанне добраахвотнікаў па аказанню арганізаванай дапамогі сацыяльна неўладкаваным пластам насельніцтва. Дабрачыннасць прайшла розныя этапы, аднак сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё ў XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абумовіла станаўленне арганізаванай дабрачыннасці, якая ахоплівала, з аднаго боку, значныя колы заможнага насельніцтва, з другога – яшчэ больш значныя колы сацыяльна неўладкаваных людзей.

---

1. Дэвис, Н. История Европы / Н.Дэвис; пер. с англ. Г.Б. Менской. – М.: Изд-во АСТ; Транзиткнига, 2004. – 943 с.

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 295. – Вып. 1. – Спр. – 6472, 6491.

3. Северо-Западный край. – 1905. – 1 ноября. – № 770.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ